Мікалай Іванавіч Гаўрычэнка

З Вікіпедыі, свабоднай энцыклапедыі

Мікалай Іванавіч Гаўрычэнка (нар. 12 снежня 1967, г. Касцюковічы, Магілёўская вобласць) — беларускі спецыяліст у галіне развядзення, селекцыі, генетыкі і ўзнаўлення сельскагаспадарчых жывёл. Доктар сельскагаспадарчых навук (2008), кандыдат біялагічных навук (1997), дацэнт (2003).

Мікалай Іванавіч Гаўрычэнка	
Дата нараджэння	12 снежня 1967 (55 гадоў)
Месца нараджэння	Касцюковічы, Касцюковіцкі раён, Магілёўская вобласць, БССР, СССР
Род дзейнасці	выкладчык універсітэта
Месца працы	Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны факультэт біятэхналогіі і аквакультуры БДСГА
Навуковая ступень	кандыдат біялагічных навук і доктар сельскагаспадарчых навук
Альма-матар	Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы

Біяграфія

Скончыў Беларуская дзяржаўная сельскагаспадарчая акадэмія (спецыяльнасць «Заатэхнія», 1991; аспірантура, 1994; дактарантура, 2007), Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы (спецыяльнасць «Менеджмент установаў прафесійнай адукацыі», 2009).

Працаваў у Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі (1991—2016, факультэт біятэхналогіі і аквакультуры, кафедра біятэхналогіі і ветэрынарнай медыцыны, прафесар, у 2000—2003 і 2014 — загадчык кафедры, 2003—2004, 2008—2009, 2014—2016 — дэкан факультэта, 2009—2014 — прарэктар па навуковай рабоце), Віцебскай дзяржаўнай акадэміі ветэрынарнай медыцыны (з 2016, рэктар, адначасова факультэт ветэрынарнай медыцыны, кафедра акушэрства, гінекалогіі і біятэхналогіі размнажэння жывёл, прафесар).

Навуковыя інтарэсы: фізіялогія рэпрадукцыі; эндакрыналогія рэпрадукцыі жывёл; распрацоўка тэарэтычных і практычных асноў гарманальнага рэгулявання і павышэння пладавітасці малочных кароў[1].

Зноскі

1. Ректор Витебской государственной академии ветеринарной медицины — Гавриченко Николай Иванович (https://www.vsavm.by/rektor/)

Узята з "https://be.wikipedia.org/w/index.php?title=Мікалай_Іванавіч_Гаўрычэнка&oldid=3805778"